УДК 398.3

***І. А. Швед***
*д-р філал. навук, праф., праф.каф. рускай літаратуры і журналістыкі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
e-mail: Shved_Inna@tut.by

# ЭНТАМАЛАГІЧНЫ КОД ТРАДЫЦЫЙНАЙ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ: ПАВУК*

*Артыкул прысвечаны гісторыка-генетычнаму і функцыянальна-семантычнаму даследаванню вобраза павука як чынніка заалагічнага кода традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. На матэрыяле розных фальклорных жанраў паказана, што міфапаэтычным мысленем беларусаў семіятызуюцца такія прыкметы павука, як колер, бляск, наяўнаць на целе выявы крыжа, «маўклівасць», здольнасць плесці павуціну, лакалізацыя ў куце, ля ікон, пад бэлькай, а таксама рух уверх ці ўніз. Павук выяўляецца як мужчынскі персанаж, працаўнік, паходжанне якога звязана з чалавекам. Касмалагічныя легенды пра павука, які «свет снаваў», сумяшчаюць матывы, звязаныя з першатварэннем і знішчэннем свету. Амбівалентна ацэнены павук судачыняецца як са сферай хтанічнага, дэманічнага, душамі памерлых, гадамі, так і са светам нябеснага, боскага, надзелены медыятыўнымі здольнасцямі, сакральным статусам, ахоўнымі і апякунскімі функцыямі ў дачыненні да Святога сямейства, розных біблейскіх персанажаў і чалавека.*

## Уводзіны

Жывёлы і заалагічны код адыгрываюць надзвычай вялікую ролю ў традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў і іншых народаў, што матывавана тым выключным значэннем, якое, як справядліва адзначыў У. Тапароў, «мелі жывёлы на ранняй стадыі развіцця чалавецтва, калі яны яшчэ не аддзяляліся з усёй рэзкасцю ад чалавечага калектыву – ні ў яго сінхранічным стане (уключэнне жывёл у сацыяльную іерархію, памяшчэнне свяшчэнных жывёл на вяршыні іерархічнай лесвіцы), ні ў дыяхранічным аспекце (ідэя паходжання дадзенага калектыву ад жывёлы ці ад жывёльнага продка), ні, нарэшце, анталагічна (уяўленне пра жывёлу як пра адмысловую іпастась чалавека)» [1, с. 440]. Практычна ўсе каляндарныя і сямейныя абрады і звязаныя з імі вербальныя тэксты, а таксама неабрадавы фальклор беларусаў, як і іншых народаў, актыўна выкарыстоўваюць заалагічны код для мадэлявання міфапаэтычнай карціны свету. Таму зразумела, што шматлікія аспекты семантыкі і функцыянальнасці заалагічных вобразаў і адпаведнай лексікі, славянскай народнай заалогіі неаднойчы станавіліся прадметам даследавання беларускіх і замежных этнолагаў, фальклярыстаў, лінгвістаў.

У шэрагу прац фальклорна-этналагічнага і этналінгвістычнага кірункаў разглядаецца сімволіка асобных жывёл, прадстаўленая ў розных відах і жанрах народнай культуры славян. Глыбока і ёміста на аснове сучаснага метадалагічнага падыходу да вывучэння традыцыйнай заасімволікі народныя ўяўленні славян пра жывёл, у тым ліку павука, рэканструююцца ў манаграфіі А. Гуры «Сімволіка жывёл у славянскай традыцыі» [2]. З улікам дасягненняў папярэднікаў расійскі этналінгвіст распрацаваў дэталізаваную схему аналізу заавобраза і ахарактарызаваў асноўныя вобразы жывёл (і адначасова цэлых груп і класаў) славянскай народнай традыцыі. Акрамя агульнай класіфікацыі прыкмет А. Гура прапанаваў культурныя «партрэты» пэўных жывёл

*Прадстаўлены некаторыя вынікі навукова-даследчай працы «Зоологический код белорусской традиционной духовной культуры (по записям XIX – начала XXI века)», якая выконваецца па ДПНД «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества» (№ дзяржрэгістрацыі 20160897 ад 13.04.2016).

(у тым ліку павука), што дазваляе ўбачыць як спецыфіку кожнай жывёлы, так і ўсю народную сістэму трактоўкі жывёльнага свету ў цэлым. Ён, на думку даследчыка, размяркоўваецца на такія класы, як дзікія звяры, гады, насякомыя, птушкі і рыбы. Пры гэтым павук з улікам яго месца ў народнай класіфікацыі жывёл разглядаецца ў складзе класа гадаў і насякомых. Ацэньваючы прадуктыўнасць такога падыходу, адзначым, што ён мае несумненную значнасць пры даследаванні заасімволікі канкрэтных этнічных традыцый, у прыватнасці беларускай. Прадстаўленая ў грунтоўнай манаграфіі А. Гуры схема задае каардынату этналінгвістычнага вывучэння вобразаў розных жывёл, стымулюе тэарэтычную рэфлексію ў галіне сістэмнага даследавання як кодаў культуры ўвогуле, так і заалагічнага кода і яго чыннікаў у традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў у прыватнасці. Пры гэтым прыведзеныя ў працы А. Гуры грунтоўныя меркаванні наконт міфалагічнай сімволікі павука патрабуюць развіцця на беларускім фальклорна-этнаграфічным матэрыяле разнапланавага характару, у тым ліку сабраным у апошнія гады ў розных рэгіёнах Беларусі.

Мэта гэтага даследавання – этнасеміятычная характарыстыка вобраза павука як чынніка заалагічнага кода традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. Паколькі традыцыйная духоўная культура вызначаецца інтэгральнасцю і сферу функцыянавання адзначанага вобраза складаюць фальклорныя жанры (павер'і, легенды, загадкі, прыказкі, прымаўкі і да т. п.), абрадавыя практыкі, лексіка і фразеалогія, гэтыя ўзаемаўзгодненыя каналы трансляцыі этнакакультурнай інфармацыіі з'яўляюцца аб'ектам даследавання.

Разгледзім тэндэнцыі мадэлявання вобраза павука ў адзначаных кантэкстах. Уяўляецца, што найбольш універсальнымі параметрамі семіятызацыі павука выступаюць яго дзеянні, функцыі (прэдыкаты) і прыкметы (атрыбуты). У залежнасці ад прыпісаных функцый павук у даследаваных тэкстах розных жанраў беларускага фальклору можа адносіцца да персанажаў розных тыпаў. Так, павук – *мужчынскі персанаж, працаўнік*, паходжанне якога звязана з чалавекам.

Заўзятая працавітасць, як заўважылі У. Лобач і С. Санько, калісьці і падвяла павука і нават сталася для яго конам-праклёнам. Паводле захаванай на Гомельшчыне версіі колішняга этыялагічнага міфа, павук і пчала былі братам і сястрой. Аднойчы, калі памірала іх маці, прыляцела сарока – спачатку да пчалы, а потым і да павука – і паведаміла сумную вестку. Пчала адразу ж кінула сваю працу і паляцела да маці, а павук, спаслаўшыся на вялікую занятасць, застаўся за сваёй працай. За гэта маці пракляла яго, і ён вымушаны вечна ткаць сваё павуцінне і ніяк яго не скончыць [3, с. 336] (характэрная загадка: «Без станка і без рук, а кросны тчэ. – Павук» [4, с. 149]). «Гэты матыў перагукаецца з вядомым старагрэцкім міфам пра суперніцтва майстрыхі-ткаллі Арахны (ад ст.-гр. Αράχνη 'павук') з вялікай Атэнай і пра яе пакаранне за пахвальбу сваім майстэрствам ператварэннем у павука, які з тае пары вечна мусіць ткаць павуцінне. Прыведзеная вышэй версія тлумачыць і пачатак непрыязных, нават варожых дачыненняў паміж павуком і пчалой, якія больш выразна праяўляюцца ў казцы "Каваль", дзе павук палоніць у павуцінне пчалу сабе на спажытак. Пчалу ратуе каваль, за што пчала паказвае яму крыніцу з жывой вадой» [3, с. 336].

Мужчынская прырода павука выявілася ў варажбе цяжарных жанчын пра пол дзіцяці, якое павінна з'явіцца на свет. «Калі дажыналы, то робылы бараду, рвалы калоссе і клалы крыж-накрыж. Тады яшчэ цяжарныя жаночыны ворожылы, хто народыцца. Калі ў траве знаходылы павучка, то будэ хлопец, а калі чорненькую

казюльку – то дзяўчына» (*ФА; Мачулішча, Камянецкі р-н). Вядомая беларускай традыцыі і асацыяцыя павука з удаўцом. Так, жнеі пасля праполвання барады варажылі пра будучае замужжа – падымалі снапы, на якіх яны спажывалі дажынкавую яешню, і глядзелі, што будзе пад імі. Калі бачылі павука, то гэта прадказвала шлюб з удаўцом [3, с. 336].

Павуку прыпісана *касмаганічная* функцыя, ён выступае ў ролі *крэатара, творцы свету,* адпаведна павуку нельга шкодзіць. Паводле легендаў і вераванняў, «повук світ сосновав, як світ начынався. Когда-то, до тых давных врэмэнов, повук засновав світ. І нэльзя ёго бэты» [5, с. 373], «і повука… тожэ нэможно забываты, шчо вродэ основывався свет, так як повукі» [6, с. 115], «павука нельга біць, таму што ён сьвяшчэнны, сьвет саснаваў» [7, с. 585], *«Свяшчэнны» павук-крэатар* мог уяўляцца памочнікам Божай Маці: «Ткань розводыв павук, як світ робывся. То ёго нельзя быты. І він помогав Матэры Божэй. [А калі дапамагаў?] – Ну як начынаўся світ. Начыналася перва жызнь людска» [5, с. 374]. З прыведзеным касмаганічным сюжэтам, верагодна, стасуюцца наступныя ўяўленні: «Ото летаюць такіе белые полосы. Это Божая Маці прадзе і свое ніткі пускае. А павук іх ловіць і пляце гэтае павуцінне. От і все. А я, малая, наловлю этых ніток на палку, ды нясу. А баба: “Божа, Божа, шо ж ты наробіла?! То Божа Маці прадзе, шоб повук плёў Ёй гардзіны, шоб завешываці Ёй!”» (Тонеж, Лельчыцкі р-н) [7, с. 484]. Уяўленні пра далучанасць павука да актаў першастварэння свету, верхняга яруса светабудовы, пра яго кантакт з сакральнымі персанажамі і самім Богам матывавалі надзяленне яго свяшчэнным стусам: «Прыдумалі, што ён карысны, што ён павуціну пляце… Я кажу: а які ён карысны, калі ён павуціны гэтай начапае? А яна: не, нельзя забіваць, ён як бы ат сьвятога. Ат такога вот, што сьвятыя… Сьвятыні ён ужо некія прыношуе» [8, с. 531]. На высокі семіятычны статус павука і яго ўлучанасць у касмалагічныя сюжеты паказвае актуалізацыя гэтага заавобраза ў загадках архаічнага тыпу, якія займаюць важнае месца ў песнях навалецця: «А што чорна, ня чэрнючы? // А што бела, ня белючы? // А што блішчыць, не малюючы? // – Чоран воран ня чэрнючы, // Лебедзь белы ня белючы, // Павук блішчыць не малююючы» [9, с. 34].

Як крэатар павук «выступае своеасаблівым індыкатарам пры выбары месца пад новае жытло: калі на новым месцы ён за ноч сатчэ ў збане павуцінне – месца лічылася ўдалым» [3, с. 336]. «Магчыма, што менавіта касмаганічныя функцыі павука і яго павуціння адлюстраваныя ў адным з народных назоваў сузор’я Плеяды (або Воза) – Сіта, паколькі павук з павуціннем звычайна загадваецца праз сіта: “Вісіць сіта, не рукамі віта, хто адгадае, той многа знае”» [3, с. 336], «Сіта без рук звіта. – Павуцінне», «На полцы, у вуголцы ляць сіта, ды не рукамі шыта. – Павуцінне» [4, с. 149].

У тэкставай прасторы «народнай Бібліі», як вядома, этыялогія (касмагонія) і эсхаталогія (канец свету) складаюць рамачную канструкцыю, полюсы якой адлюстроўваюць адзін аднаго. Адпаведна легенды пра павука, які «свет снаваў», сумяшчаюць матывы, звязаныя з першатварэннем і знішчэннем свету. Калі пляценне павукомдэміургам павуціння ў першачасы станоўча ацэньвалася як першапачатковая фаза касмагенезу, фаза ўсталявання сувязі паміж усім жывым і Богам (таму забаронена забіваць павукоў і рваць павуцінне), то, згодна з шэрагам славянскіх легенд, другаснае зацягванне свету павуціннем перашкаджае жыццю людзей (з-за павуціння яны не бачаць дарогі, праўды і г. д.). Снаванне павуком новага свету лічыцца грахом. Узмацненне негатыўнай канатацыі гэтых міфалагічных уяўленняў у эсхаталагічных

**ФА – Фальклорны архіў студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі БрДУ імя А. С. Пушкіна «Фальклярыстыка і краязнаўства» (кіраўнік – І. А. Швед).*

наратывах адбываецца не толькі праз указанні на другаснасць стварэння «сусветнай павуціны», але і праз падкрэсліванне яе дэманічнай прыроды – «сетка», якая аблытвае свет (неба), маркіруецца як жалезная – гэта драты: «Да то Святое Пісаньне пісалося. Шо нэбо будэ змотано дротом. Хто то верыв? Шчо жэлэзны птушкі будуть лэтать. Потом, шчо жывы мэртвому будэ завідуваты» [6, с. 133]. Пры гэтым як у касмалагічных легендах, так і ў эсхаталагічных прадказаннях можа выкарыстоўвацца адзін і той жа дзеяслоў «снаваць» – павук снаваў свет, і ў апошнія часы свет «аснуецца павуцінай», але яна будзе жалезнай – павуціна мае тэхнагенную сутнасць; металічнымі будуць і іншыя, некалі «жывыя» рэаліі: «Вот, сынок, прыйдзе такая ўрэм’я, оснуецца сьвет павуціною, і будуць лётаць жэлезные пташкі по небу» [6, с. 134]; «Будзя ўвесь сьвет на павуціне аснован, увесь сьвет!» [7, с. 577]; «Прыдзіць урэмя, будзець усё зматана вакруг у павуціну. У павуціну абаўецца. Во, цяпер правады» [10, ч. 2, с. 273]. Жалезная павуціна разам з жалезнымі жывёламі выступае прыкметай канца свету. Свабодна распрасцёрты з часоў тварэння белы свет «когда-то сплецёцца, всё ровно, как павукі плетуцца, о так. Потому шо тоды нічого не було – ні электрічества, ні радіва, ні телефонов, нічого ж не було» [6, с. 137].

У шматлікіх фальклорных кантэкстах «бажэсьцьвенны» павук выступае *медыятарам*, які злучае розныя ярусы светабудовы і іх насельнікаў, звязвае людзей з Богам: «Мяне ўсё ўрэмя ўбіждалі, што павука нільзя трогаць, патаму што павук даходзіць да Бога па сваім павуціньнійку» [10, ч. 1, с. 36], «Павука біць нельзя. Ён жа бажэсьцьвенны, ён жа Богу даносіць усё па павуціне» [10, ч. 1, с. 36]. Лёгкасць, «павет-ранасць» павуціння звязвае павука са сферай нябеснага, боскага [3, с. 336]. Павук транслюе ў чалавечы свет недасягальныя людзям веды і, надварот, інфармуе Бога пра паводзіны людзей. Паводле легенды, «павуку вызначана ад Бога глядзець за хлебам». Ён пільна сочыць за людзьмі, якія кідаюць крошкі хлеба і, узносячыся на павуцінні да неба, дакладае аб гэтым Богу, а Бог карае людзей за гэта памяншэннем ураджаю [3, с. 336]. «Суаднесенасць павука з нябесным, салярным (дзякуючы асаблівасцям будовы, формы павуціння) супрацьпастаўляе яго хтанічным істотам. Так, нельга было абрываць і вымятаць павуцінне ў гумне, бо іначай развядуцца мышы» [3, с. 336].

Далучанасць павука да іншасвету тлумачыць яго вяшчунскія здольнасці. Так, павук, які спускаўся па сваім павуцінні ў хаце, прадвяшчаў з’яўленне гасцей. Мелі значэнне як месца, так і час спускання павука па павуцінні. Калі павук спускаецца перад кімсьці, то таго чакае нейкі прыпадак, не абавязкова ўдалы. Каб унікнуць непажаданых вынікаў, раілі такога павука спаліць жыўцом. Аднак удача ці няўдача тут залежала ад часу з’яўлення павука: калі перад абедам ці проста ўдзень, то чакае непрыемнасць, калі ж пасля абеду ці ўвечары, то прыпадак будзе ўдалы. Калі павук спускаецца проста на галаву чалавеку, той атрымае нейкі падарунак, яго чакае дарога або ён атрымае ліст. Павук, які спускаецца на стол або ў пасудзіну ў час яды, прадвяшчае прыбытак у хаце, удалае завяршэнне распачатых справаў, але, магчыма, сям’я мае патаемнага ворага [3, с. 336]. У Брэсцкім Палессі і Цэнтральнай Беларусі лічаць, што павук прыносіць у чалавечы свет інфармацыю пазітыўнага зместу, калі паўзе ўверх. У Брэсцкім раёне павука забіваюць, калі бачаць яго скіраваным уніз (ФА; Люта). З апатрапейнай мэтай такому павуку могуць паказваць фігу: «А еслі павук спускаецца па павучынні ўніз, гэта не к дабру. А еслі наабарот уверх падымаецца – к дабру. А еслі спускаецца – нада яму фігу паказаць, тады ён пойдзець уверх. І еслі па сцяне спускаецца – тожа фігу паказаць. Я ад бабы сто разоў чуў» [8, с. 531]. У падобных выпадках звяртаюцца і да вербальнай магіі: «Павука біць нільзя. Нельзя, тож святы павучок. Ён урэда ня дзелаіць, павуцінку

зьдзелаіць – і ўсё. Павуцінінку этую ўбраў, а павучка ня бі – нільзя. А вот спускаецца павучок, як маленькі павучок вот спускаецца, а ты гавары, што: “Павук, павук, на добрае – угору, на дрэннае – уніз, на добрае – угору, на дрэннае – уніз”. Як угору – тады харашо, а як уніз – тады хужэ» [10, ч. 2, с. 268]. Семантыка дарогі ў сувязі з вобразамі павука і павуціння праглядае і ў вясельнай песні: «Божа, Божа! // Павучок па сценцы йдзе, // Павуцінейка вязе. // Божа, Божа! // Леначка да столу йдзе, // Мамачцы ў ножкі падзе: // – А мамачка родная, // Перайдзі дарожаньку…» « [3, с. 336]. У прыкметах семіятызавалася і афарбоўка павука: «Ну если спускается с хаты де-то, мо... если спускается чёрный – значит, какую-то новость может принести плохую» (ФА; Фядоры, Столінскі р-н); «Мама казала: “Павука ніколі не бі, дочачка. Колькі будзеш жыць на сьвеце… Выкінь і ўсё”. Павук сівенькі – харошыя весьці. Павук чорны – кепскія весьці» [11, с. 233].

Розная ацэнка прадказанняў з вобразам павука можа тлумачыцца і яго глыбіннымі міфалагічнымі значэннямі: «Відавочная амбівалентнасць вяшчунскіх здольнасцяў павука звязаная з яго судачыненнем з пачатковымі фазамі касмагенезу. Ён сімвалізуе сабой менавіта той пракаветны ідэальны стан Сусвету (не кранутых яшчэ распадам і хаосам вырай), калі ўсе рэчы і ўсе істоты былі злучаныя паміж сабой і з богам-творцам нябачнымі нітамі-павуцінкамі, і які пазней быў людзьмі страчаны» (М. Эліядэ). Нездарма ў старажытных касмагоніях Бог – Стваральнік Сусвету – параўноўваўся менавіта з ткачом-павуком, а сам працэс стварэння Сусвету прыпадабняўся да працэсу вытыкання тканіны, дзе аснова (у іншых адменах – уток) сімвалізавалася пачатковымі водамі. У стараіндыйскай традыцыі гэта сам Брахма. У беларускай касмагоніі гэты вобраз хутчэй суаднесены з іншым удзельнікам стварэння Сусвету, будучым антаганістам Бога-Творцы, чортам: «Моташна чорту, хочацца яму ўсё насенне з жывата выкінуць, от ён снуе па вадзе, бы павук, да ўсё блюе. Па немалым часе ўся вада закрылася лазою да ракітаю». Апроч іншага і за гэта павука забаранялася біць, бо “павук новы свет снуе, а гэта грэх”» [3, с. 336]. Падваенне, паўтарэнне нечага ўвогуле адмоўна ацэньвалася міфа-паэтычным мысленнем.

У павука, як і ў большай часткі гадаў і насякомых (змяі, жабы, чарапахі, крата, чарвяка, цвыркуна, павука, чорных тараканаў, мурашоў і інш.), выяўляюцца функцыі *хатняга гаспадара* («Павук – эта хазяін дома» [8, с. 531]), *апекуна, ахоўніка*, што зблiжае яго з *дамавіком, душой продка* – «прашчура» («шчур» як назва гада) і, адпаведна, з багаццем. Жыхарка вёскі Люта, адмоўна адказваючы на пытанне, ці забівае яна павукоў, казала нам, што нават калі нікога са сваякоў няма ў хаце, яна заўсёды адчувае на сабе позірк свядомай істоты – за ёю ўвесь час сочыць нейкі асаблівы павук, не такі як усе астатнія (ФА; Брэсцкі р-н). Дагэтуль існуе забарона забіваць павукоў-«дамавікоў»: «Домовік – павук, нэ можна быты. Кажут, што нэ дрэнны. Павутыну ўзяты на шчо такое і выкінуты, а не быты» [5, с. 552], «[А з павукамі звязаны якія-небудзь прыкметы?] – Весць несут. – [А Вы забіваеце павукоў?] – Нет, я іх выбрасываю. Муху ўб’ю, а паўка как-то рука не поднімаецца» (ФА; Люта, Брэсцкі р-н). Дзве жыхаркі вёскі Вялікія Радванічы, адказваючы на пытанне, ці можна забіваць павукоў, гавораць: «Нэльзя. Категоріческі нельзя». – «А я дэ колы махну». – «А я, еслі там словіла, на уліцу выкінула». – «А я дэ колы, дэ колы гнэздо убачу, і того, там і прэб’ю» (ФА; Брэсцкі р-н).

Лічылі, што калі заб’еш павука або парвеш павуціннe, то будзе балець галава ці здарыцца нейкае іншае няшчасце: «Еслі заб’еш павука, будзець балець галава» [8, с. 531], «Як паука затрошчыш і пауць порвеш, то голова будзе болець» [12, с. 501]. На Століншчыне кажуць, што «няможна павукоў у хаце біць, а то грашэй не будзе» (ФА; Мачуль, Столінскі р-н). Паводле іншых меркаванняў, за забойства павука ў чалавека сорак грахоў будзе [5, с. 392–393]; «Як заб’еш павука, так сорак грахоў будзеш несьці

на гэтай зямлі. [А чаму?] – Ну так Бог даў. Чужыя грахі тады трэба атпакутваць» [11, с. 533]. На Беларуска-Польскім памежжы – у Бельска-Падляшскіх аколіцах – павука не б’юць, каб не было няшчасця (ФА).

Разам з тым павук, звязаны з засветамі, смерцю, душамі людзей, улучаецца ў *дэманалагічны* кантэкст і адмоўна ацэньваецца. Выразным прыкладам сказанаму можа быць міфалагічны аповед пра тое, як мужчына лавіў на рацэ рыбу. «Пад вутра рыба так ловіцца, ісключыцельна. Паяўляецца, гаворыць, павук, бальшу-ую такі круг здзелаў, после павука палучаецца бурбалка: бур, бур, бур вада. І ён крычыць з вады: “Душа нада!” Душа нада! Дык еты дзед спугаўся, кінуў эту рыбу лавіць і пайшоў. І вот ён ідзець, а дзевачкі бягаюць купацца. І ён гаворыць дзевачкам: “Дзевачкі, ня ідзіце, я так і так слышаў”. А яны пайшлі. Толькі раздзеліся, каторая первая ўвайшла ў ваду, тая і патанула… Вот і ўсё. “Душа нада!” Душу забіраець… У вадзе ж яны і ў балоце ж яны. І ў вадзе яны, і ў балоце яны. Іхняе жыцельства. Ну, канешне, яны цяпер у хатах бываюць, усюды. Горы ж празрушылі. Яны сядзелі ў горах акованы» [8, с. 476].

Як і іншыя *гады*, павук лічыцца *атрутным*. Так, на Случчыне верылі, што на дубе, які «зімою не скідае лісту, а вясною развіваецца вельмі позно», «водзіцца такі павучок, што як яго з’есць говядо, та прападзе» [13, с. 56]. Павука маглі лічыць *прычынай* аднайменнай *хваробы* сэрца. Ад хворага сэрца – «ад павука» – раілі ўжываць мёд: «Калі павук трапіў у ежу, а з ёю ў страўнік чалавека, то лячыць мёдам» [12, с. 710]. У выслоўях вобраз павука выкарыстоўваецца для негатыўнай ацэнкі чалавека: «Нашатырыўся як павук [і сядзеў моўчкі]» [14, с. 354], «Во набраўся як павук» [14, с. 294], «Праціўны як павук» [14, с. 369].

На беларуска-расійскім памежжы замест павука-выратавальніка з’яўляецца вобраз *павука-даносчыка*: «Не білі. На павука казалі: “Хазяін на дварэ”. А мы ўсё раўно іх… (смяецца). А ўродзе бы другія кажуць, што нада забіць. Вот кінеш ты дзе крошачку хлеба. Павук ета бярэ і нясе, і ўжэ Богу паказывае. Ну знаеш, за паджыгацеля: “Во, во, палядзіце-ка, як людзі хлеб раськідаюць! Значыць, ім трэба паменей, каб меней ім хлеба даставалась, штоб яны не раськідалі, а ўсё паядалі”» [7, с. 480].

Нярэдка матывіроўкай забароны забіваць павука выступае яго *апякунская функцыя* адносна *Святога сямейства*, падчас уцёку якога ў Егіпет павук спрыяў тым, што сплёў павуціну, і Божая Маці з Сынам схаваліся пад ёю ад пераследнікаў: «Дід був Онуфрій. Казав, шо нэ можно павука забываты, бо за ёго сорок грэхів будэ… Павукы сплэлы такую сетку, шо тые забойцы, шо хотілы взяты Божу Маці, воны нэ бачылы. То благодаря павукам. За павутой засновалы до такой степэні, шо нічэво не было відно. Божу Матер закрылы» [5, с. 392–393], «Павука біць няможна. Затоя, што Мацер Божая ішла з Ісусам Хрыстом і яго хацелі ўністожыць. Яна ўлезла ў яму, а павукі скоранька заплялі. Дык ляцелі гэтыя, што хацелі ўбіваць Ісуса Хрыста, дык кажуць: “Тут нічога німа, тут павуцінай усё зацянута”» [10, ч. 1, с. 36]; «Божая Маці бегла, а за ей бег жыды і хацелі яе забіць. І нідзе не было ні кустоў, нічога. Толькі бегла, глядзіць, мост, яна тады скоранька пад мост. А павукі яе павуцінай абняслі. Абняслі, абняслі, а тыя паглядзелі пад мост, яе ня ўвідзілі – і яна асталася жывая. Затоя і павукоў нельзя біць» [10, ч. 1, с. 36–37]. На Берасцейшчыне апавядаюць: «Калі ж Божа Мацер породіла Іісуса Хрыста, то Вона ж ховаласа, ходіла. Ховалас скрозь, з месца на месца пераходзіла з Маленькім, бо Яго шукалі, хацелі ўбіць. Вона под ёлочку стала, і ее павук аплёў павуціннем усю кругом, тую ёлачку. І Вона там сядзела ўсё ўрэм’я. <…> Павук абплёў і закрыў. І тым ставят ёлкі, убірают в разные цацкі… І павука тым не можна біць, бо вон спас Іісуса Хрыста» [5, с. 393], «Жыды шукалі Суса Хрыста. Под дзіраво сіла (Божа Маці. – *І. Ш.*), а павук

засновав тэе дзерво, коб вот ішлі, не ўгледзелі Божу Мацер с Ісусом Хрыстом. <…> І павука не можно біць за гэто, шо павук спас Божу Мацер» [5, с. 392].

На Гродзеншчыне таксама павука забаранялі біць за тое, што ён уратаваў Святое сямейства, заткаўшы павуціннем уваход у пячору ці «заплёўшы дарогу», і гэта ўвяло пераследнікаў у зман [3, с. 336]. Паводле запісу з Брэстчыны, «говорілі, шо когда этот Ісус Хрістос прятався, маленькім… І пауцінкой заплелі дорогу. І вжэ той Юда, ішлы эты Его… І говорят эты: “Тут ніхто, тут дажэ человек не проходів”. То пауков всегда моя мама выкідвала [не біла]» (ФА; Лелікава, Кобрынскі р-н). Паводле матэрыялаў з Гомельскага Палесся і Падняпроўя, «калісь Марыя – Мацер Божая – с Іісусам Хрыстом маленькім хавалася па павуцінах ад палачоў… Там, дзе авечкі былі. Там жа ў кажнам сарае павуціны поўна. Яна і хавалася так: дзе навіта павуціна, дак залазіла», «Дак білі тых ужо дзяцей, колькі ж выразалі. А Яна схавалась, быў стары дом – дзьвярэй не было, нічога. І яны кінулісь туды – а дзьвярэй няма – і ўсё заснована павуцінай. Дак яны падышлі і кужуць: “Тут павук аснаваў павуцінай, яны не йшлі, яны б прарвалі б”. А яны там былі. А ўсьлед Гасподзь аснаваў павуціну. І вот так і астаўсь Хрыстос жыў» [7, с. 558]. Павукі могуць заплятаць яму, каб Божая Маці не разбілася: «Як Матка Боская уцякала з Панам Езусам, і выкапана была яма, каб Яна ўвалілася і прапала з Дзіцям гэтым. А павукі сабраліся, згаварыліся, і яны ўзялі павучыньнем гэтым, як посьцілкай, засьцялілі, засьцялілі. Матка Боская з Дзіцяткам на павучыньне гэтае села і прасядзела датуль, пакуль Яе шукалі і йшлі, каторыя Пана Езуса бераглі. Яна на гэтым павучынні задзяржалася» [11, с. 360].

Нярэдка павукі і павуцінне згадваюцца ў сувязі са Страсцямі Хрыстовымі: «Ісус Хрыстос, як ужэ хацелі Яго замучыць гэтыя ўжэ… Яго шукалі, як была ноч цёмная-цёмная. А ён упаў – галлё такое ляжала. Ён так шуснуў туды і пайшоў у тое галлё – там яма была выкапана. І павучкі заплялі павуценнем, а Ён там ляжаў. Ну і заплялі. А яны <тыя жыды> кажуць: “Што мы будзем шукаць, калі тут павуценне дажа ўсё цэлае!”» [5, с. 401], «Іісус Хрыстос уцякаў ужэ ат разбойнікаў. Забег – хата там ужо старая была. Абеглі за ім бандзіты. А тут павуціна. Уся на дзвярах павуціна – значыць, тут нікога няма. Павук спас. Нельга павучка біць. Ганяем гэтага па хаце, гэтага павучка. Спас Ісуса Хрыста павучок. Дак хай ужо павуцце ў хаце вісіць!» [7, с. 557]. Павук і павуціна фігуруюць і ў занатаваных на Берасцейшчыне народна-біблейскіх аповедах пра распяцце Хрыста – яны давалі цень распятаму Хрысту: «Вот я кагда-та чула, нашы бабушкі і мамы гаварылі, што павукі абвілі Ісуса Хрыста, на распяц'і ён быў. Яны абвівалі яго, аграждалі сваімі, ценямі сваімі» (ФА; Малышы, Ляхавіцкі р-н). Паводле матэрыялаў з Гродзенскага Панямоння, «калі Бог вісеў на крыжы, так павучок ат сонца зрабіў гэту павучынку, зацянуў. Каб Яму ў вочы сонца не сьвяціла» [11, с. 360].

Такім чынам, павук – гэта *боская істота, ахоўца Святога сямейства* і іншых біблейскіх персанажаў (Давіда, Мухамеда і пад.), якой *забараняецца шкодзіць*. Паводле падання, ратуючы цара Салімона (Саламона), павук заплёў павуціннем уваход у пячору, у якой хаваўся цар Салімон, і тым падмануў варту, якая таго шукала. Можа гаварыцца і пра выратаванне павукамі нейкага чалавека: «Вабшчэ нельзя біць [павука]. Кажуць, даўней у калодзежы павучыння надзелалі. А там чалавек сядзеў. А тады нешта… Тоя павучыння спасло таго чалавека. Нельзя біць» [8, с. 532]. Павук таксама *абараніў абраз*: «Ну, ікону он зашчыціл от всякого грэха. Мацер Богородіцу <…> Павуціной. Ад злых людзей» [5, с. 427].

Сакральны статус павука і адпаведна забарона на яго забойства могуць матывавацца яго *лакалізацыяй у «святым месцы»* («Говорылы, тому нэ можна павука забываты,

шо вун над царскімы двэрамы, павук. Потому ёго нэ можна забываты» [5, с. 427]), а таксама выявай крыжа на целе. Павука нельга забіваць, «потому шо ў него на сьпіне есьть крэсьтік <…> У кожного. Хоть он і вред дзелае, шо павуціны… Павуціны снімают, павука куда-то… Но ўбівать нельзя» [5, с. 427]. Месцазнаходжанне павука пад бэлькай, якая мела сакральны статус (загадка: «Пад бэлькаю асмаляны верабей сядзіць. – Павук» [4, с. 149]), у куце (у тым ліку чырвоным), як слушна адзначылі У. Лобач і С. Санько, дазваляе разглядаць яго як *ахоўніка сям'і* і яе *дастатку*. Гэта выяўляецца ў распаўсюджаным звычаі рабіць саламяныя аб'ёмныя ўпрыгожванні – «павукі» – напярэдадні Калядаў і Вялікадня і вешаць іх «на шчасце» ў покуці над сталом. Невыпадковай з'яўляецца форма гэтых вырабаў: шарападобная (нагадвае сонца з разыходнымі прамянямі), рамбічная (ромб як архаічны сімвал урадлівасці і пладнасці) і зоркападобная» [3, с. 336]. Выразна сувязь жывога і саламянага павукоў (з іх функцыяй аховы дому) высвечваецца ў наступным запісе: «[Павука нельга забіваць]. Ну, вот яны ахраняюць дом. От ранней жа павукі рабілі саламяныя. Яны ахраняюць дом, як бы такія дамавыя» [7, с. 731].

Павук фігуруе і ў мэтэаралагічных прыкметах, прычым яго вяшчунская функцыя служыць матывіроўкай узнікнення забароны на забойства: «Нельзя павука забіваць. Павук дажа паказуе пагоду. Дажа можа вылезьці з леса, павук, таму што ён па сонцу дажа тчэ павуціну. І хто разьбіраецца, нікагда ў лес не заблудзіць. Нікагда. Вот на юг, на поўдня, таўсьцейшая павуцінка, на север – танейшая павуцінка. На захад і на ўсход – адна і тая павуцінка. А тады для гэтыя павуцінкі, для чатырох етых знакаў, ён клетачкі ўстаўляе, наводзіць із павуцінкі» [8, с. 532]; «Зайшоў адзін друг к свайму і па сцяне поўзаў павук. Ён узяў і яго забіў. А той прышоў у хату і глядзіць: няма павука. – А дзе павук? – Я яго забіў. І ён абідзіўся. Ён яму прэдсказываў пагоду: калі на рыбу іці» [10, ч. 1, с. 36–37].

У замовах павук можа выконваць функцыю *памочніка*: «Як от запарушыш вока, дак тягают за вейку и кажуть: "Паўчок, паўчок, // Выйди на далинку, // Выньми парушынку. // Парушынка скачэ, // А (імя) плача"» [12, с. 487]. Павук выкарыстоўваўся ў *народнай медыцыне*. Так, ад малярыі «некаторыя ў лушпіне арэха (альбо ў напарстак) запіхваюць павука, зашываюць у кавалачак палатнянай анучкі і вешаюць хвораму на шыю. Хворы не павінен зазіраць у анучку, бо не дапаможа» [12, с. 211]. Ад ліхаманкі карысным лічылі насіць на шыі загорнутага ў анучку навознага жука, які быў знойдзены ў дарожнай каляіне і змешчаны ў арэхавую лупінку, павука, знятага з прыдарожнага дрэва, жабу ў анучцы і скуру змяі пасля лінькі… як толькі хвароба пачне праходзіць, кінуць усе гэтыя прадметы на бягучую ваду» [12, с. 241]. Ад «ячменю» раілі «паука зхлапаці, памяці і да ока прытуліці, і ячмень загіня» [12, с. 499]. «Ад спугу шукаюць павука, задушац яго і ў топленае малако, а тадэ працэдзюць і піць даюць» [12, с. 652]. Ад пярэпалахаў павука «чорнага ловюць. Лапкі атрываюць. А тады яго ў хлеб і даюць... А павук чорны, жопка вялічанькая» [12, с. 652]. Ад пярэпалахаў трэба было «злавіць ці тры, ці дзевяць павукоў з вугла, раздавіць, працадзіць у чарку і даць выпіць» [12, с. 652] (у апошнім выпадку гаючыя ўласцівасці павука ўзмацняюцца праз апеляцыю да сакралізаваных лічбаў – лікавага кода).

*Павуціна* (у прыватнасці, з чырвонага кута) выкарыстоўвалася ў народнай медыцыне разам з вяночкамі з купальскіх кветак: «Прыходзіць, значыт, прыходзіць яна, ну крысьціцца, моліцца, малітву чытаець і патом ідзець – у хаці с краснага вугла бярэць павуцінку, дзе ёсць якая… І вот накрэст бярэць павуцінку гэту сабіраець, уродзі бы гэту, складваіць, патом вянок гэты на галаву надзеваіць гэтаму… [хвораму]» [10, ч. 2, с. 126]. Павуціна фігуруе ў актах ачышчальнай магіі: «Во время уборки жилья, когда снимаете

веником паутину с потолка и стен, говорите: “Что пришло – на веник перешло!”» (ФА; Беражное, Столінскі р-н). На вялікае значэнне павуціны ў міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў указвае і прадстаўленасць яе вобраза ў загадках тыпу «Нітак многа, а ў клубок не зматаеш. – Павуцінне» (ФА; Магілёўцы, Пружанскі р-н), «Ныток много, а в клубок ны змотаеш. – Павуціна» [5, с. 613].

**Заключэнне**

У заключэнне адзначым, што міфапаэтычным мысленнем беларусаў семіятызуюцца такія прыкметы павука, як колер, бляск, наяўнаць на целе выявы крыжа, «маўклівасць», здольнасць плесці павуціну, лакалізацыя ў куце, ля ікон, пад бэлькай, а таксама рух уверх ці ўніз. Павук у традыцыйнай міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў – гэта мужчынскі персанаж, працаўнік, паходжанне якога звязана з чалавекам. Касмалагічныя легенды пра павука, які «свет снаваў», сумяшчаюць узаемазвязаныя матывы першатварэння і знішчэння свету. Павук судачыняецца як са сферай хтанічнага, дэманічнага, душамі памерлых, гадамі, так і са сферай нябеснага, боскага, надзелены медыятыўнымі здольнасцямі, сакральным статусам, ахоўнымі і апякунскімі функцыямі ў дачыненні як да чалавека, так і Святога сямейства ды розных біблейскіх персанажаў. Адпаведна яшчэ і ў наш час пашыраны забароны з рознымі матывіроўкамі шкодзіць павуку.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Топоров, В. Н. Животные / В. Н. Топоров // Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. ; гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Рос. энцикл., 1994. – С. 440–449.
2. Гура, А. В. Символика животных в славянской народной традиции / А. В. Гура. – М. : Индрик, 1997. – 912 с.
3. Лобач, У. Павук / У. Лобач, С. Санько // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – С. 335–336.
4. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 363 с.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Беларус. навука : Выш. шк., 2001–2013. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – 2008–2009. – Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – 2009. – 863 с.
6. Беларуская «народная Біблія» ў сучасных запісах / уступ. арт., уклад. і камент. А. М. Боганевай. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 116 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Беларус. навука : Выш. шк., 2001–2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – 2012–2013. – Кн. 2. – 2013. – 1231 с.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Беларус. навука : Выш. шк, 2001–2013. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – 2010–2011. – Кн. 2. – 911 с.
9. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В. Д. Ліцвінка, Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.
10. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад. А. У. Лобач. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – 2 ч.

11. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2001–2013. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Кн. 2. – 2006. – 636 с.

12. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / уклад. Т. В. Валодзінай. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 776 с.

13. Сержпутоўскі, А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

14. Выслоўі / склад. М. Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 01.07.2019

***Shved I. A.* Zoological Code of the Traditional Spiritual Culture of Belarusians: Spider**

*The article is dedicated to historical and genetic and functional-semantic research of the image of a spider as a factor in the zoological code of traditional spiritual culture of Belarusians. The material of different folklore genres shows that such spider signs as color, luster, presence on the body image of the cross, «silence», the ability to weave a web, localization in the corner, near the icons, under the beam, as well as moving up or down are semanticized by mythopoetic mental of Belarusians. Spider appears as a male character, worker, whose origin is associated with a human. Cosmological legend about a spider that «founded the world», combine the motifs associated with first creation and the destruction of the world. Ambivalently rated spider is associated to both the scope of chthonic, demonic souls of the dead for years, and the world of heaven, divine, endowed mediate abilities, sacred status, protective and custodial functions in relation to the Holy Family, and various biblical characters and the person.*